Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

За сталінскія кадры

Орган партбюро, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 1 (124)
Аўторак
18
студзеня
1955 г.

Цана 20 кап.

ПРАВЕСЦІ ЭКЗАМЕНАЦЫЙНУЮ СЕСІЮ НА ВЫСОКІМ УЗРОЎНІ

Экзамены па лекцыйных курсах уяўляюць сабой складаную і адказную частку вучэбна-выхаваўчага працэса. Яны трывала ўвайшлі ў сістэму вучэбнай работы універсітэта і, як указваецца ў Пастанове Совецкага Урада і Цэнтральнага Камітэта партыі ад 23 чэрвеня 1936 года, з'яўляюцца «адзіным крытэрыем паспяховасці студэнтаў».

Экзамены важны не толькі як форма праверкі, але і як спосаб абагульнення ведаў. Яны дапамагаюць самім студэнтам праверыць сябе. Кіруючыся праграмай, студэнты ліквідуюць прабелы ў сваіх ведах, удакладняюць і дапаўняюць многае з таго, што на лекцыях было зразумелым толькі ў агульнай форме.

Падрыхтоўка да экзаменаў умацоўвае навыкі самастойнай работы студэнтаў, выпрацоўвае ўменне адшукваць неабходны матэрыял, патрэбную кнігу, пашырае знаёмства з вучэбнай і навуковай літаратурай. Экзамены маюць вялікае выхаваўчае значэнне, бо яны развіваюць пачуццё адказнасці студэнтаў за сваю вучэбную работу.

Наша партыя і ўрад удзяляюць вялікую ўвагу падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў. З кожным годам пашыраецца сетка вышэйшых навучальных устаноў, павышаюцца ўмовы для плённай вучэбнай, навуковай і даследчай работы.

У нашым універсітэце, нягледзячы на рад цяжкасцей з чытаннем курсаў у кароткія тэрміны, першы семестр 1954-55 вучэбнага года закончыўся паспяхова. Вучэбныя планы, зацверджаныя Міністэрствам вышэйшай адукацыі, амаль поўнасцю выкананы. На факультэтах і кафедрах своечасова разгарнулася дэталёвая падрыхтоўка да экзаменаў. Усе кабінеты папоўніліся літаратурай, устаноўлены строгія часы работы. Дадаткова арганізавана чытальная зала.

У кабінеце вывешаны спісы літаратуры і графікі кансультацый. Своечасова зроблен расклад экзаменаў з улікам пажаданняў студэнтаў. Рэктаратам і грамадскімі арганізацыямі універсітэта намечан цэлы шэраг мерапрыемстваў, якія будуць садзейнічаць паспяховаму правядзенню зімовай экзаменацыйнай сесіі.

Патрабаванні, прад'яўляемыя кафедрамі да адказаў на экзаменах, складваюцца гадамі і ўзбагачаюцца новымі данымі навукі і практыкі. Шляхам абмену вопытам і параўнання вынікаў экзаменаў паступова выпрацоўваецца пэўны падыход да ацэнкі ведаў студэнтаў.

Ад студэнта патрабуецца глыбокае веданне пройдзенага матэрыялу, уменне правільна фармуляваць думкі, увязваць набытыя веды з практыкай сацыялістычнага будаўніцтва.

З 6 студзеня пачалася экзаменацыйная сесія, якой папярэднічаў перыяд здачы залікаў. Папярэднія вынікі здачы залікаў сведчаць аб дастаткова глыбокіх ведах студэнтаў. Аб гэтым-жа сведчаць вынікі першых экзаменаў, якія праведзены на радзе курсаў. Так, залікі на IV курсе хімфака па палітэканоміі (экзамінатар т. Баравік) усе студэнты здалі добра, паказаўшы глыбокія веды пройдзенага матэрыялу. Студэнты I курса хімфака ўсе залікі здалі таксама паспяхова.

Аднак ёсць яшчэ катэгорыя студэнтаў, якія несур'ёзна аднесліся да такой адказнай справы, як сістэматычная работа пры падрыхтоўцы і здачы залікаў і экзаменаў. Не з'явіліся на залікі студэнты другога курса філалагічнага факультэта Корань, Хоміч, Рыбак і Аўраменка, студэнты III курса таго-ж факультэта Бондар і Гарбацэвіч. Не атрымалі заліку па замежнай мове студэнты аддзялення журналістыкі В. Малышава, С. Фурманец (II курс), Нікіфарава (IV курс). Студэнтка I курса біёлага-глебавага факультэта Кусніч не здала ні аднаго заліку, студэнт II курса аддзялення геалогіі геолага-геаграфічнага факультэта Кучар не здаў залік па палітэканоміі. Слаба здавала залікі студэнтка I курса юрыдычнага факультэта Ражова. Назіраюцца ганебныя выпадкі карыстання шпаргалкамі, што з'яўляецца абманам дзяржавы ў асобе экзамінатара.

Толькі пры ўмове ўпартай, настойлівай працы студэнтаў па глыбокаму і ўдумліваму засваенню матэрыяла, намаганняў кафедраў і грамадскіх арганізацый у справе максімальнай дапамогі студэнтам у падрыхтоўцы кожнага чарговага экзамена, мы здолеем з найлепшымі вынікамі правесці экзаменацыйную сесію 1954-55 вучэбнага года.

ГЕОРГІЙ МАКСІМІЛІЯНАВІЧ МАЛЕНКОЎ
вылучан кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Ленінскай выбарчай акрузе № 1

15 студзеня на ўрачысты сход, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, сабраліся выкладчыкі, аспіранты, студэнты, адміністрацыйна-гаспадарчыя работнікі універсітэта.

Слова для адкрыцця сходу прадастаўляецца старэйшаму супрацоўніку нашага універсітэта прафесару Нікалаю Фёдаравічу Ярмоленка.

— Працоўныя нашай рэспублікі рыхтуюцца зараз да выбараў у Вярхоўны Совет БССР. Сваімі кандыдатамі ў дэпутаты народ вылучае лепшых сыноў і дачок нашай Радзімы—людзей, якія ўсе свае сілы і веды аддаюць самай высокароднай справе—пабудове комунізма. Ад імя вучоных і ўсіх грамадскіх арганізацый нашага універсітэта я прапаную кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Ленінскай выбарчай акрузе горада Мінска Георгія Максіміліянавіча Маленкова, старшыню Совета Міністраў СССР.

Затым тав. Н. Ф. Ярмоленка коратка расказаў біяграфію Г. М. Маленкова.

Са словам падтрымкі выстаўленай кандыдатуры выступіла выкладчыца В. А. Захарава. Яна гаворыць, што гэтыя выбары пройдуць у абстаноўцы небывалага росквіту нашай Радзімы. Ад Ціхага акіяна і да Эльбы людзі будуюць новае радаснае і шчаслівае жыццё, наша Радзіма ідзе наперадзе ў пабудове светлага комуністычнага грамадства.

— Я з радасцю падтрымліваю кандыдатуру тав. Г. М. Маленкова, вернага вучня В. І. Леніна і бліжэйшага саратніка І. В. Сталіна,— заканчвае сваю прамову В. А. Захарава.

Студэнтка IV курса хімічнага факультэта Мая Марчанка гаворыць аб клопатах Комуністычнай партыі, якія адчувае на сабе наша студэнцкая моладзь.

— Я выкажу думку ўсіх студэнтаў, калі заверу з гэтай трыбуны, што, горача падтрымліваючы кандыдатуру Г. М. Маленкова, мы даем слова нашай партыі авалодваць ведамі, вучыцца так, як заклікаў нас да гэтага вялікі Ленін.

Ад комсамольскай арганізацыі універсітэта выступае студэнтка III курса Рыма Маленчанка, ад аспірантаў тав. Мартавіцкі, ад партыйнай арганізацыі прафесар І. Н. Лушчыцкі.

Бурнымі апладысментамі сустрэў сход прапанову прафесара Лушчыцкага паслаць тэлеграму Г. М. Маленкову.

Тэкст тэлеграмы прымаецца адзінадушна:

«Масква, Крэмль, Старшыні Совета Міністраў Саюза ССР таварышу Маленкову Георгію Максіміліянавічу.

Дарагі Георгій Максіміліянавіч! Калектыў прафесараў, выкладчыкаў, аспірантаў, студэнтаў і вучэбна-дапаможных работнікаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна вылучыў Вас кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР і просіць Вас, Георгій Максіміліянавіч, даць сваю згоду балатыравацца кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Ленінскай выбарчай акрузе № 1 горада Мінска.

Па даручэнню сходу—Прэзідыум».

Затым аднагалосна была прынята пастанова сходу.

ПАСТАНОВА

АГУЛЬНАГА СХОДУ ПРАФЕСАРАЎ, ВЫКЛАДЧЫКАЎ, АСПІРАНТАЎ І СТУДЭНТАЎ, АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭХНІЧНАГА ПЕРСАНАЛУ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ В. І. ЛЕНІНА

1. На падставе артыкулаў 49 і 50 Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Ленінскай выбарчай акрузе №1 горада Мінска ад калектыва прафесараў, выкладчыкаў, аспірантаў і студэнтаў, адміністрацыйна-тэхнічных работнікаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна—вернага вучня В. І. Леніна, саратніка І. В. Сталіна, Старшыню Совета Міністраў СССР, члена Прэзідыума Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай партыі Совецкага Саюза Георгія Максіміліянавіча Маленкова.

2. Прасіць таварыша Георгія Максіміліянавіча Маленкова даць сваю згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Ленінскай выбарчай акрузе №1 горада Мінска.

3. Прасіць Акруговую выбарчую камісію Ленінскай выбарчай акругі №1 горада Мінска па выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР зарэгістраваць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Ленінскай выбарчай акрузе № 1 таварыша Георгія Максіміліянавіча Маленкова.

МАЛАДЫЯ ВУЧОНЫЯ

Папоўніліся рады вучоных нашага універсітэта. Аспірант кафедры журналістыкі Г. В. Булацкі абараніў дысертацыю на тэму: «Газета «Звязда»—баявы памочнік Комуністычнай партыі Беларусі ў барацьбе за выкананне другога пяцігадовага плана рэспублікі ў галіне прамысловасці і сельскай гаспадаркі (1933—1937 гг.)».

Тры гады ўпартай напружанай працы аддаў Г. Булацкі распрацоўцы гэтай цікавай тэмы. І вось, заслухаўшы асноўныя палажэнні дысертацыі, выступаюць афіцыйныя апаненты: сапраўдны член Акадэміі навук БССР, доктар гістарычных навук, прафесар В. Н. Перцаў і кандыдат гістарычных навук, дацэнт М. С. Зярніцкі. Яны даюць высокую ацэнку працы Г. В. Булацкага. Прысутныя горача вітаюць маладога вучонага з прысваенням яму вучонай ступені кандыдата гістарычных навук.

Дысертацыі таксама абаранілі старэйшая выкладчыца кафедры рускай літаратуры Р. Б. Паіна на тэму «Роля і значэнне А. Д. Канцеміра ў гісторыі рускай літаратуры» і аспірантка кафедры біёлага-глебавага факультэта В. К. Гаравец на тэму: «Біялогія і экалогія ўзбуджальніка цэркаспароза цукровых буракоў ва ўмовах Беларусі і меры барацьбы з ім».

НАРАДА АСПІРАНТАЎ

Днямі прайшла нарада аспірантаў 1-га года навучання і іх навуковых кіраўнікоў. На нарадзе выступіў прарэктар універсітэта па навуковай частцы тав. Павецьеў.

Н. ПАЎЛАЎ.

Задачы агітколектыва напярэдадні выбараў

Падрыхтоўка і правядзенне выбараў у Вярхоўны Совет БССР і мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных—сур'ёзная палітычная кампанія, якая ставіць важныя задачы перад партыйнай арганізацыяй універсітэта па забеспячэнню высокага палітычнага і арганізацыйнага ўзроўню агітацыйна-прапагандысцкай работы сярод выбаршчыкаў.

На вопыту мінулых выбараў партыйнае бюро універсітэта зацвердзіла план мерапрыемстваў, якія будуць праводзіцца на агітпункце ў перыяд падрыхтоўкі і правядзення выбараў. План прадугледжвае выкарыстанне ўсіх форм і сродкаў агітацыйна-масавай работы сярод выбаршчыкаў (сходы, даклады і лекцыі, гутаркі агітатараў, чытка газет, наглядная агітацыя, наведванне кіно і музеяў, калектыўнае радыёслуханне і г. д.).

Ідэйны ўзровень агітацыйна-масавай работы ў значнай меры залежыць ад саставу лектараў, дакладчыкаў, агітатараў. Для работы сярод выбаршчыкаў партыйныя бюро факультэтаў вылучылі 116 агітатараў, сярод якіх падаўляючую большасць складаюць лабаранты, аспіранты і студэнты старэйшых курсаў.

Забеспячэнне 100-працэнтнага наведвання семінараў агітатарамі, пастаянны кантроль за іх работай павінен знаходзіцца зараз у цэнтры ўвагі партыйных і комсамольскіх арганізацый факультэтаў.

Аднак, не ўсе партыйныя і комсамольскія арганізацыі факультэтаў уявілі сабе адказнасць і сур'ёзнасць работы з агітатарамі. Мала ўдзяляюць увагі гэтаму пытанню партыйныя арганізацыі фізмата (сакратар т. Зяцькоў), філфака (сакратар т. Булацкі) і гістарычнага факультэта (сакратар т. Шнеерсон). У выніку наведванне семінараў агітатарамі гэтых факультэтаў вельмі нізкае. На першы семінар з агульнага ліку 18 агітатараў фізмата з'явілася толькі 2, а з 29 агітатараў філфака—усяго 8. Гістарычны факультэт замест 27 агітатараў прыслаў на семінар толькі 8.

Мала аказвае дапамогі рабоце агітатараў камітэт комсамола, а прафком і мясцком зусім адышлі ад гэтай важнай палітычнай кампаніі.

Партыйнымі бюро факультэтаў зацверджаны старшыя агітатары, абавязкі якіх заключаюцца ў тым, каб пастаянна кіраваць работай агітколектыва свайго факультэта, падтрымліваць пастаянную сувязь з агітпунктам універсітэта, садзейнічаць правядзенню мерапрыемстваў на агітпункце. На жаль, вылучаныя старшыя агітатары слаба займаюцца гэтымі пытаннямі, не наведваюць семінараў, рэдка бываюць на агітпункце (тт. Авечкін, Марыніч і др.).

Сумесныя намаганні партыйнай, комсамольскай, профсаюзнай і іншых грамадскіх арганізацый універсітэта—залог паспяховага правядзення выбарчай кампаніі.

Н. ПАЎЛЕНКА,
кіраўнік агітколектыва.

НА СЛІЗКІМ ШЛЯХУ

На пятым курсе аддзялення беларускай мовы і літаратуры ішоў залік па курсу славянскіх літаратур. Дацэнт В. М. Цімафеева заўважыла, што студэнтка С. Грамыка карыстаецца шпаргалкай. На заўвагу выкладчыка Грамыка рэагавала своеасабліва: кінуўшы шпаргалкі на стол, выбегла з аўдыторыі.

Перад намі—трыццаць пяць дробна списаных алоукам лісткоў паперы. На кожным з іх стаіць чарговы нумар. Знешне гэта кавалак чыстай паперы. Яго можна на вачах у выкладчыка дастаць з кішэні і пачаць на ім нешта запісваць. Але навошта запісваць? Варта перавярнуць паперку на другі бок, і на ёй знойдзеш адказ на пастаўленае ў білеце пытанне. Але самае цікавае, што ўсе шпаргалкі напісаны рознымі почыркамі. Бачна, што пытанні былі размеркаваны паміж студэнтамі курса і кожны з іх павінен быў распрацаваць па два адказы. Адным словам, калектыўная шпаргалка!

— Мы хацелі дапамагчы сваёй сяброўцы,—апраўдваецца групорг курса З. Роўба,—вось мы і рашылі напісаць па дзве шпаргалкі і перадаць іх Грамыка. Але ёй не ўдалося. Сама вінавата.

Узнікае пытанне: як магла комсамольская група выбраць такі метад дапамогі адстаючай сяброўцы? Хіба нельга было выдзеліць двух—трох выдатнікаў, каб яны дапамаглі Грамыка? Хіба нельга было, нарэшце, даць ёй добры канспект, калі яна не мела свайго? Няўжо комсамольцы курса на чале з тав. Роўба не разумеюць, што такой дапамогай яны ашукалі сяброўку і хацелі ашукаць выкладчыка?

Але і тут групорг знаходзіць «апраўданне»:

— Канспектаў у нас добрых не было. На лекцыі хадзілі нерэгулярна, канспектавалі па чарзе... Самім хаця-б здаць!

І сапраўды, большасць студэнтаў групы прышла да заліку непадрыхтаванай. Дрэнна адказвалі М. Карнеева, Г. Кляўко, А. Падгруша. Выкладчык В. М. Цімафеева на старонках насценгазеты «Слова філолага» піша, што студэнты амаль зусім не чыталі мастацкіх тэкстаў. Напэўна, многія шкадавалі, што Грамыка «засыпалася» на пачатку заліка і ім не ўдалося выкарыстаць уласнаручна напісаныя шпаргалкі.

Але хіба такія шпаргалкі могуць выратаваць студэнта, калі ён нічога не ведае? Не. Вось адна з іх, адзначаная нумарам 14. Гэта адказ на пытанне аб творчым шляху А. Міцкевіча. Ужо ў першым радку гаворыцца, што польскі паэт памёр у... 1856 годзе. Можа гэта выпадкова, што аўтар шпаргалкі не ведае даты, якую ў гэтым годзе будзе адзначаць увесь свет? Не. У шпаргалцы толькі пералічаны творы А. Міцкевіча, блытана пераказана яго біяграфія. Нічога не сказана, які ўплыў мела дружба з рускімі сябрамі, з Пушкіным, у прыватнасці, як Пушкін і Міцкевіч па-рознаму распрацоўвалі тэму «Меднага конніка»; ні слова аб тым, што ляжыць у аснове творчага метаду Міцкевіча, аб трагедыі паэта, адарванага ад Радзімы. Відавочна, што па такой шпаргалцы немагчыма адказаць.

Вось шпаргалка пад нумарам 16. У ёй гутарка ідзе аб паэме А. Міцкевіча «Пан Тадэуш». Відаць, аўтар шпаргалкі сам не чытаў паэму, бо пераблытаў яе змест, ні слова не сказаў аб вобразах твора, яго ідэйнай і мастацкай вартасці. Што можа даць шпаргалка аб тэме пераўтварэння сялянскай вёскі ў балгарскай літаратуры, калі тут нават не называецца вядучы твор Гуляшкі «М. Т. Станцыя». Хіба можа выручыць шпаргалка аб літаратурных дыскусіях у краінах народнай дэмакратыі, калі тут знойдзем толькі некалькі агульных фраз ды разважанні аб адной дыскусіі... у Англіі? А гаворачы аб творчасці Пруса, аўтары шпаргалак умудрыліся не сказаць ні слова аб супярэчлівым шляху пісьменніка, яго адносінах да ідэй пазітывізма.

Чытаеш шпаргалкі і дзіву даешся: няўжо могуць быць на пятым курсе такія непісьменныя студэнты?! Вось некалькі «перлаў». «Маці», 1936 год гэта паварот да палітычнага (?!) рэалізма» (шпаргалка № 30 аб творчасці Чапэка). «Нацыяналісты-соцыялісты хацелі ўзяць завод у свае рукі», «нават у турме дапамагае выратавацца тым, хто яшчэ на волі, бяручы на сябе іх адказнасць» (аб героіцы Фучыка). «На Баразне»—праўдзівы паказ трагедыі селяніна і яго вала Сівушкі, знясіленага голадам. Змест: селянін выехаў араць, запрог вала і карову Сівушку» (аб творах Еліна-Пеліна); «У гэтым творы няма аднаго (?) героя, аўтар паказаў цэлы гістарычны пласт (?) і ўскрывае (?) значныя з'явы ў жыцці краіны» (аб рамане Пуйманавай). Каментарыі тут, як кажуць, лішнія. Падсунуць гэткую шпаргалку студэнту—і ён заблытаецца ў трох соснах!

Нельга пералічыць усе недакладнасці! Врацлаўскі кангрэс у абарону культуры стаў «Вацлаўскім кангрэсам культуры і міру». З'явіліся новыя «творы»: «Пан Бальцэр», «Трагедыя Юліус і Этэль» (ёсць паэма Канапніцкай «Пан Бальцэр у Бразіліі» і трагедыя Кручкоўскага «Юліус і Этэль»). Сучасны польскі пісьменнік Брандыс стаў крытыкам XIX стагоддзя Брандзесам, гераіня «Лялькі» Пруса Лэнцкая стала Лонскай, а Розенбергі перакручаны ў «Розінгаў». Пяцікурснікі пішуць «Вознагражден премией мира», «трефоретнасть», «чехотка». І яны праз поўгода стануць выкладчыкамі мовы і літаратуры!

Студэнты пятага курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры не зразумелі, што перад экзаменамі яны сталі на слізкі шлях ашукання саміх сябе, сваіх таварышоў і выкладчыкаў. Метад здачы экзаменаў і заліка ў на шпаргалках павінен знайсці самае суровае асуджэнне.

І. МАЛЬДЗІС.

О КРУЖКАХ И ПРОЧЕМ...

Внизу, в вестибюле,
На стендах, на стенках
Висят объявленья
Различных оттенков.
То кистью,
То просто
Пером от руки
Написаны просьбы
Явиться в кружки:

В бальный и мото,
В туристский и фото,
В спортивный, стрелковый,
Хореографический,
В кружок хоровой
И кружок драматический;
В кружок, изучающий
Тему такую:
«Як я над канспектам
І кнігай працую».

И, вперив глаза
В разукрашенный стенд,
Стоит перед стендом
Обычный студент.
И вдруг со студентом
Случилось несчастье:
Студент на глазах
Разорвался на части.
В известном стихе Маяковского
И то не случалось таковского.

Там люди разорваны
Надвое только,
А здесь—
Поглядите-ка сами,
На сколько!
Ноги шагают в бальный и мото,
Руки
В спортивный, стрелковый и фото,
И, грустно качая
Своей головой,
Спешит голова
В кружок хоровой.

Одна из частей
На экзамен пришла
И робко присела
На стул у стола.
С волнением трепетным
Взяла билет,
Пролепетала смущенно
В ответ:

«Работать над книгою
Надо упорно,
Чтоб знанья
Потом применять
Плодотворно.
Нужно конспекты
Вести аккуратно,
Иначе бывает потом
Неприятно».

Истины эти, конечно,
Правдивы,
Но,
Как догадаться, конечно.
Могли вы,
Она излагает
Тут тему такую:
«Як я над канспектам
І кнігай працую».

А книги самой
Не читала.
Для этого
Времени мало!

Хорошее дело
Кружки хоровые,
Мотокружки
И кружки духовые,
Но если загружен
Студент до предела,
Это, конечно, неважное дело.

Пусть сочетаются
Истины обе:
Отдых—кружкам,
Время—учебе!

Я. БЯЗЫМЕННЫ.

ФЕЛЬЕТОН

Рыцар дамы пік і маскоўскай саракаградуснай

Іван Іванавіч Перарэпенка да канца дзён сваіх помсціў былому сябру Івану Нікіфаравічу за тое, што той у запале спрэчкі абазваў яго «гусаком».

Скажам не затойваючы: повад для помсты ў студэнта V курса філалагічнага факультэта А. Гусака быў больш падстаўным: нехта даў матэрыял ва універсітэцкую газету, у якім, між іншым, гаварылася аб тым, што Гусак захапляецца гульнёй ў карты. Западозранне пала на старшыню студкома інтэрната № 1 т. Зарэцкага і яго намесніка т. Паляшчука.

Гусак, зразумела, не падаў скаргі ў судовую палату, як гэта зрабіў у свой час Іван Іванавіч. І не таму, што зараз такой палаты не існуе, а проста ён адчуваў сябе дастаткова мужным і моцным, каб самому пакараць вінаватых. Гусак—гэта не Перарэпенка. І, каб у гэтым пераканаліся другія, ён, прап'янстваваўшы цэлую ноч, на світанні 27 снежня ў 6—00 атакаваў дзверы пакоя № 90 у інтэрнаце на вуліцы Свердлова. Раз'юшаная лаянка і грукат узнялі на ногі цэлы паверх. Адчыніўшы дзверы, усе са здзіўленнем разглядвалі п'яную істоту, якая размахвала рукамі і нагамі.

Будучы «чэсным» п'яніцам, Гусак не нападаў з-за вугла. Ён адкрыта кінуў пальчатку Паляшчуку, выклікаючы яго ў калідор, каб утварыць мардабой у прысутнасці грамадства. Але гэтым людзям былі невядомы пачуцці рыцарскай чэсці. Дарэмна Гусак, нібы барс, кідаўся на натоўп, які закрыў подступ да пакоя; дарэмна гэты дон-кіхот трубіў у рог і клікаў на адкрыты паядынак: ніхто не жадаў звязвацца з хуліганам. Яго проста выштурхнулі з калідора і адвялі ў пакой дзяжурнага. Ніхто не спачуваў яму, акрамя Марцава, былога студэнта, выключанага ў мінулым годзе з універсітэта за сістэматычнае п'янства.

— Друг жыцця,—шаптаў пяшчотна Гусак на вуха таварышу, абняўшы адной рукою яго за шыю, а другой падліваючы водку ў склянку,—выпі, мілы, а не то—задаўлю... Помсты прагну...—Ры гэтых словах Гусак піхнуў сваю галаву ў талерку з расолам.

Вільгаць ажывіла і натхніла пакутніка. Гусак узняўся на ногі і, ускрыкнуўшы нешта ваяўнічае, пайшоў за дзверы. За немагчымасцю дастаць шпагу Гусак прыхваціў бутэльку. Наперад! Але другая атака была адбіта, як і першая. Гусака выштурхнулі за дзверы, пасля чаго ён згубіў усякую ахвоту да штурмаў.

...Існуе думка, як-бы помсцячы п'яніца не раздзяліў лёсу свайго вернага сябра Марцава.

А. ПЯТРОЎСКІ.

ЗАЛІКІ ПРАЙШЛІ ПАСПЯХОВА

Групы студэнтаў пад дзвярыма аўдыторый, узрушаныя галасы, пытанні: «Здаў?», «Што папалася?», «Віншую»,—усё гаворыць, што ў студэнтаў надзвычай важная і адказная пара—зімовая экзаменацыйная сесія.

... Генадзій Круглік з хваляваннем палажыў заліковую кніжку перад выкладчыкам. Першы залік... Першая праверка ведаў, набытых ва універсітэце. Вось і пытанні. Прачытаўшы іх, Генадзій пераконваецца, што ўпартая праца над тэарэтычным курсам фізікі на працягу поўгода, стараннае выкананне лабараторных работ не прапалі дарэмна: усё было зразумелым і лёгкім.

— Паднятае над зямлёй цела валодае патэнцыяльнай энергіяй,—пачаў адказ Генадзій. Ён растлумачвае вызначэнне моманту інерцыі дынамічным спосабам. Выкладчыца Раіса Варфаламееўна Лушчыцкая задаволена яго глыбокім, вычарпальным адказам.

— Цяпер Элеанора Шварцбург адказвае,—сказала адна з стаяўшых каля дзвярэй аўдыторыі дзяўчат, калі радасны і шчаслівы вышаў з аўдыторыі Генадзій.—Добра-ж ведае Эля матэрыял,—дадала яна, прыслухоўваючыся да спакойнага, упэўненага голасу сяброўкі.

А Эля сапраўды адказвала выдатна. Ставячы ёй залік, Раіса Варфаламееўна па-сяброўску ўсміхнулася і сказала:

— Калі будзеце адказваць гэтакжа вясной на экзамене, пяцёрка гарантыравана.

Выкладчыца была задаволена адказам студэнтаў першага курса аддзялення фізікі. Добра здаюць залікі і студэнты другіх курсаў фізіка-матэматычнага факультэта. Сярод студэнтаў, добра здаўшых залікі, О. Рудак, Бічэнкоў, Зяцькоў, Васільеў, Васілеўскі і многія другія.

В. ПАУЛОВІЧ.



У 1-ым семестры гэтага года асабліва не павязло універсітэцкаму стэнду выдатніка. Калі фотавітрыны лепшых спартсменаў і ўдзельнікаў самадзейнасці ўпрыгожваюць калідоры універсітэта, то гэты стэнд, як бачна з фота, сіратліва стаіць на першым паверсе біякорпуса. Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР паспела зацвердзіць прадстаўленых рэктаратам выдатнікаў да Сталінскіх стыпендый, а акадэмічны сектар камітэта комсамола і прафкома не выбралі часу падняць на шчыт выдатнікаў вучобы.

НА VIII МІЖНАРОДНЫМ КАНГРЭСЕ БАТАНІКАЎ

* * *

У снежні мінулага года для студэнтаў нашага універсітэта прэзідэнт Акадэміі навук БССР, член-карэспандэнт Акадэміі навук СССР, прафесар В. Ф. Купрэвіч прачытаў лекцыю аб сваіх уражаннях аб паездцы ў Францыю на Восьмы Міжнародны кангрэс батанікаў і ў Афрыку.

У сувязі з тым, што праслухаць лекцыю змаглі далёка не ўсе жадаючыя, рэдакцыя газеты «За сталінскія кадры» звярнулася да прафесара В. Ф. Купрэвіча з просьбай напісаць артыкул на гэтую тэму і даць некалькі зробленых ім там фотаздымкаў.

*

У першай палавіне ліпеня мінулага года ў Парыжы адбыўся 8-ы Міжнародны кангрэс батанікаў, на якім была прадстаўлена дэлегацыя СССР у саставе 17 чалавек. На кангрэсе прысутнічала звыш 1500 дэлегатаў. Найбольш многалікай была французская дэлегацыя.



Французская Гвінея. Жыллё неграў племені фула.

Кангрэс уяўляў сабой буйную навуковую падзею. Бяспрэчна, што ён зробіць значны ўплыў на развіццё батанічных навук.

На кангрэсе было заслухана звыш тысячы дакладаў па розных пытаннях батанікі. Найбольшую цікавасць выклікалі даклады совецкіх вучоных. Аўдыторыі, у якіх выступалі совецкія батанікі, былі, як правіла, перапоўнены.

Гэта, безумоўна, невыпадкова. У адрозненне ад амерыканскіх, англійскіх, французскіх і раду другіх вучоных, даклады якіх у асноўным уяўлялі сабой прыватныя, звычайна невялікія навуковыя даследаванні, даклады совецкіх батанікаў былі прысвечаны найбольш буйным дасягненням совецкай батанікі ў распрацоўцы важных навуковых праблем.

Наша біялагічная навука за чатырохгоддзе пасля 7-га кангрэса ўнесла многа прынцыпова новага ў навуку. Совецкія вучоныя распрацавалі такую важную навуковую тэму, як засваенне раслінам вуглекіслаты глебавага раствору, пытанне аб біяхімічнай актыўнасці карнявой сістэмы, аб класіфікацыі расліннага пакрову на зямным шары, аб пераўтварэнні прыроды раслін, інтрадукцыі і акліматызацыі раслін і г. д. Гэтыя новыя навуковыя пытанні паспяхова вырашаны совецкімі вучонымі.

Значная частка зарубежных батанікаў з вялікай цікавасцю аднеслася да дакладаў совецкіх вучоных. Характэрна тое, што мічурынская навука, нягледзячы на ўсе рагаткі і перашкоды, якія ёй ставіць пэўная частка буржуазных вучоных, знаходзіць у капіталістычных краінах з кожным годам усё больш і больш паслядоўнікаў.

У першыя дні работы кангрэса французскія вучоныя наладзілі прыём у вялікім амфітэатры Сарбоны. Прыём, або дакладней сход, быў прысвечаны 100-годдзю французскага батанічнага таварыства. Совецкая дэлегацыя ў якасці падарунка французскім вучоным прывезла каля 300 кніг па батаніцы. Гэты дружалюбны крок совецкіх вучоных выклікаў у французскіх батанікаў пачуццё падзякі і з'явіўся сведчаннем прыязных навуковых сувязей. Члены кангрэса з вялікай цікавасцю наведалі выстаўку совецкіх навуковых кніг, якая была арганізавана ў памяшканні Сарбоны.

У час кангрэса было арганізавана некалькі экскурсій у ваколіцы Парыжа. Мы наведалі Версаль, агледзелі славутасці версальскага палацу. У якасці гістарычнай рэліквіі нам паказалі стол, за якім быў падпісаны Версальскі дагавор.

З усіх славутасцей Версаля нас, біёлагаў, асабліва зацікавіў Версальскі парк. Гэта стары, але вельмі вялікі і прыгожы парк. У ім сабрана вялікая колькасць розных парод дрэў. Другі вялікі парк Фонтэнбло, які займае каля 17 тысяч га, таксама прадстаўляе вялікую цікавасць наяўнасцю ў ім шматлікіх добра выражаных раслінных асацыяцый.

З вялікай цікавасцю агледзелі мы Лувр—гордасць французскага народа. У ім сабраны лепшыя творы мастацтва, пачынаючы з часоў старажытнай Грэцыі і канчаючы XX стагоддзем. Вялікія карцінныя і скульптурныя галерэі, у якіх сабраны выдатныя палотны Рубенса, Леанардо да-Вінчы, Рафаэля, Давіда, Рэмбранта, Інгрэса і другіх, зрабілі на нас вялікае ўражанне.

Пасля пасяджэння кангрэса ўсе дэлегаты накіраваліся ў Ніццу, дзе кангрэсу належала закончыць сваю работу. Шлях ляжаў праз Арлеан, Ангулем, Бардо, да Пірэнеяў і адтуль праз Лурд, Нарбонн да ўзбярэжжа Міжземнага мора ў Ніццу. Увесь гэты шлях мы прарабілі на працягу 12 дзён, знаёмячыся адначасова з сельскай гаспадаркай, расліннасцю і гістарычнымі помнікамі Францыі. Асабліва вялікае ўражанне зрабіў Арлеан, горад, які звязан з гераічнай барацьбой французскага народа за сваю незалежнасць. Арлеан—вельмі прыгожы. Ён увесь тоне ў зеляніне і кветках.

На шляху ў Ніццу мы застанавіліся ў горадзе Орлесе, заснаваным яшчэ старажытнымі рымлянамі. Тут мы наведалі вялікі калізей—старажытнарымскі тэатр, які ўмяшчае да 5 тысяч чалавек. Трэба сказаць, што гэты выдатны помнік старажытнасці знаходзіцца ў вельмі запушчаным стане. Аднак ён аказаўся больш шчаслівым у адносінах да двух іншых тэатраў, якія пабудаваны рукамі французскіх продкаў—старажытных галаў: адсутнасць належнага нагляду за імі прывяла да таго, што яны прышлі ў непрыгодны стан і ўяўляюць груды развалін. З размовы з адміністрацыяй калізея мы даведаліся, што тэатр дзейнічае



Мост, сплецены з ліан праз раку Дзіані.

толькі ў летні час, калі ў ім праводзяцца розныя спектаклі. Зімой тэатр пустуе.

Кангрэс закончыўся ў Ніццы. Пасля кангрэса ўсе дэлегаты накіраваліся ў Парыж, дзе ў Сарбоне адбылося ўрачыстае закрыццё кангрэса. Пасля гэтага дэлегаты разышліся па сваіх пакоях, каб развітацца з сябрамі і сабраць свае рэчы. Праз некалькі гадзін мы ўжо ехалі на аўтамабілях у Марсель, дзе нас чакаў параход, які павінен быў адвезці нас у Афрыку.

Марсель—вялікі порт на Міжземным моры. Ён размешчаны на ўзбярэжжы ў вельмі прыгожым месцы. Горад стаіць на пагорках, якія ўтвараюць вялікую бухту. Марсель—горад кантрастаў. Тут ёсць вельмі прыгожыя вуліцы, дамы, сады, але ёсць і вельмі брудныя, цесныя вуліцы, дамы, якія нагадваюць трушчобы.

Марсель—вялікі порт. Тут мы ўбачылі многа розных параходаў, якія прыбылі з розных краін свету. Тут мы ўбачылі і наш савецкі параход «Ленін», які прыбыў з Одэсы.

Наш параход «Ламартын» адышоў ад берагоў Францыі ў вечары. Ноч прайшла спакойна. Раніцай мы ўбачылі ўдалечыні берагі Іспаніі. Праз некалькі гадзін мы ўжо праходзілі праз Гібралтарскую пратоку. Справа ад нас была Еўропа, а злева—Афрыка. Праз пратоку мы праходзілі вельмі блізка ад берагоў. Мы добра бачылі горы, якія ўтвараюць берагі пратокі. Праз некалькі гадзін мы ўжо ехалі ў Атлантычным акіяне.

Праз тры дні мы прыбылі ў порт Дакар. Дакар—сталіца французскай Заходняй Афрыкі. Ён размешчаны на ўзбярэжжы Атлантычнага акіяна. Горад стаіць на пагорках. Ён вельмі прыгожы. Тут ёсць вельмі прыгожыя вуліцы, дамы, сады. Але ёсць і вельмі брудныя, цесныя вуліцы, дамы, якія нагадваюць трушчобы.

Дакар

ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ

СТАРТУЮЦЬ ЛЫЖНІКІ

У парку Чэлюскінцаў сабраліся многія дзесяткі юнакоў і дзяўчат, якія павінны былі удзельнічаць у спаборніцтвах па лыжах на прыз адкрыцця сезону. Ад кожнай спартыўнай арганізацыі былі выстаўлены толькі лепшыя лыжнікі. Ад нашага універсітэта ўдзельнічалі 6 мужчынскіх, 6 жаночых, 2 юнацкіх і адна каманда дзяўчат. Усяго ад універсітэта выступала 60 спартсменаў.

У праграму спаборніцтваў уваходзіла эстафета 4х5 км для мужчын і юнакоў і эстафета 4х3 км для жанчын і дзяўчат. На агульнаму выніку ўсіх эстафет універсітэт заняў 3 прызавае месца, адстаўшы ўсяго на 2 ачкі ад лыжнікаў медыцынскага інстытута. Першае месца і прыз адкрыцця сезону ўпэўнена выйграў згуртаваны калектыў інстытута фізічнай культуры, у камандзе якога знаходзіліся мацнейшыя лыжнікі рэспублікі.

Лыжнікам універсітэта патрэбна абмеркаваць вынікі спаборніцтваў і выправіць памылкі, якія былі дапушчаны ў перыяд трэніровак.

6 студзеня былі дадзены старты гарадскім адборачным (перад першынствам рэспублікі) спаборніцтвам юнакоў і дзяўчат. Кожны ўдзельнік спрабаваў з максімальнай хуткасцю прайсці дыстанцыю, каб папасці ў зборную юнацкую каманду горада Мінска. Ад універсітэта ўдзел у гэтых спаборніцтвах прынялі 6 юнакоў і тры дзяўчыны, якія стартавалі адпаведна на 10 і 5 км. Добрыя вынікі паказалі прадстаўнікі каманды універсітэта Стрыгалёў і Ногатаў. Абодва ўдзельнікі выканалі норму III спартыўнага разраду, заняўшы адпаведна III і VIII месцы і тым самым выйшлі ў састаў зборнай каманды сталіцы. Ніжэй сваіх магчымасцей выступілі дзяўчаты. Ні адна з іх не выканала разрадных нарматываў.

Трэнеру і кафедры фізічнага выхавання неабходна прыцягнуць да ўдзелу ў занятках лыжным спортам большую колькасць спартсменаў.

У бліжэйшы час намечана правядзенне першынства ВНУ горада Мінска і рэспублікі па лыжнаму спорту. Так 9 студзеня ў раёне аўтазавода адбылася агульнауніверсітэцкая трэніроўка, пры гэтым зроблен прабег на 10 км мужчын і юнакоў і на 5 км жанчын і дзяўчат.

Сярод мужчын лепшымі аказаліся студэнт фізіка-матэматычнага факультэта Іўко з часам 44,05 мінуты, студэнт геолага-геаграфічнага факультэта Козей—44,45 мінуты. Яны ўкладліся ў норму III спартыўнага разраду. З дзяўчат адной толькі прадстаўніцы юрыдычнага факультэта Ражковай удалося выканаць разрадны нарматыў. Яна прайшла дыстанцыю за 28,00 мінут.

А. УХАНАЎ.

ПЕРАМОГА ШАХМАТЫСТАЎ УНІВЕРСІТЭТА

У снежні мінулага года праходзіла камандная першынства ВНУ горада Мінска па шахматах і шашках. Кожная каманда складалася з 10 шахматыстаў і 6 шашыстаў.

Моцную каманду па шахматах выставіў наш універсітэт. У яе складзе гулялі кандыдат у майстры А. Ройзман і такія вядомыя першаразраднікі, як Ліўшыц, Голеў, Дземянцеў (усе яны члены зборнай каманды ДСТ «Навука», якая заваявала першынства Белпрофсаюза).

З першага-ж тура, выйграўшы ў каманды кансерваторыі з лікам $9\frac{1}{2} : \frac{1}{2}$, наша каманда захапіла лідэрства і ўтрымлівала яго да канца спаборніцтва. Лёс першага месца па сутнасці быў вырашан тады, калі нашы шахматысты з лікам $6\frac{1}{2} : 3\frac{1}{2}$ выйгралі ў моцнай каманды медыцынскага інстытута, узначальваемай кандыдатам у майстры Левіным. Разрыў у ачках паміж лідэрам і другімі прэтэндэнтамі на першае месца ўзрастаў з кожным турам. Аб сіле гульні нашых шахматыстаў сведчаць перакананчыя перамогі над камандамі інстытута замежных моваў і педагагічнага інстытута. У гэтых сустрэчах каманда універсітэта перамагла з «сухім» лікам 10 : 0.

У выніку наша каманда ўпэўнена заняла першае месца, набраўшы $67\frac{1}{2}$ ачка з 80 магчымых.

За другое месца да апошняга тура вялася ўпартая барацьба паміж камандамі медыцынскага і політэхнічнага інстытутаў. Больш вопытным медыкам ўдалося дабіцца перавагі ўсяго на поўачка. Яны занялі другое месца з вынікам $54\frac{1}{2}$ ачка, політэхнікі засталіся на трэцім (54 ачкі).

Прайшоўшыя спаборніцтвы яскрава сведчаць аб узросшым майстэрстве нашых шахматыстаў. У нашай камандзе асабліва добра гуляла моладзь. А. Наумовіч (7-я дошка), які зусім нядаўна выканаў норму першага разраду, у гэтых спаборніцтвах паказаў сябе сталым шахматыстам. Яго вынік—8 ачкоў з 8 магчымых. Выдатнага выніку (8 з 8 магчымых) дабілася таксама маладая шахматыстка Ф. Кацнельсон, якая гуляла на дзесятай дошцы.

Значна слабей выступілі нашы шашысты. Згуляўшы ўнічыю (3 : 3) у апошнім туры з параўнаўча слабай камандай педагагічнага інстытута, яны вымушаны былі задаволіцца толькі трэцім месцам.

А. БАЛАШ.

У штангістаў

У спаборніцтвах беларускага Совета ДСТ «Навука» каманда штангістаў універсітэта ў саставе Жэлвакова, Кавалёва, Карпіна, Гуціна і Эпштэйна прадэманстравала нядрэнную падрыхтоўку і згуртаванасць калектыву. Сярод многіх камаңд вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі, дзе штанга культывіруецца ўжо многа год, нашы спартсмены паказалі ўпартасць і волю да перамогі.

Студэнт юрыдычнага факультэта Н. Жэлвакоў вышаў пераможцам у лёгкай вагавай катэгорыі, паказаўшы ў суме трохбор'я 274 кг (жым 80 кг, рывок—82 кг і штуршок 112 кг), тым самым выканаў норму другога спартыўнага разраду. Удала выступілі маладыя штангісты Кавалёў у сярэдняй вазе і Карпін—у найлягчэйшай. Абодва яны ў першы раз выканалі нормы III разрада, заваяваўшы пры гэтым другое месца. Кавалёў у суме трохбор'я паказаў 262,5 кг (жым 77,5, рывок 82,5 кг і штуршок 102,5 кг), а Карпін 187,5 кг (55, 55, 77,5 кг). Вялікі поспех спартсменаў!

Трэці спартыўны разрад выканаў і студэнт геолага-геаграфічнага факультэта Е. Гуцін, які выступіў ніжэй сваіх магчымасцей і застаўся на пятым месцы.

СПАБОРНІЧАЮЦЬ ПРЫГУНЫ

На адбыўшымся ў канцы мінулага года трэнерскім совеце ДСТ «Навука» з удзелам прадстаўнікоў буйнейшых ВНУ рэспублікі было прынята палажэнне аб правядзенні Дня прыгуна ў зімовых умовах. У далейшым спаборніцтвы па прыжках у закрытым памяшканні павінны праводзіцца з года ў год і стаць традыцыйнай сустрэчай мацнейшых прыгуноў вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі.

І вось адбыліся спаборніцтвы мацнейшых прыгуноў у вышыню, у даўжыню і ў трайным скачку.

У першую нядзелю спаборнічалі мужчыны і жанчыны ў трайным скачку і ў даўжыню, пры гэтым прыгаць прыходзілася з малага разбегу, з якіх-небудзь 4—5 метраў. Далей усіх скакнуў удаўжыню студэнт хімічнага факультэта нашага універсітэта Л. Станішэўскі. Яго вынік 5 м 48 см, які з'яўляецца зусім нядрэнным ва ўмовах малага разбегу. Ён заваяваў першае месца і ў трайным скачку. Нязначных вынікаў дабіліся дзяўчаты. Адной толькі Бондаравай (1 курс геолага-геаграфічнага факультэта) удалося заняць III месца. Увогуле калектыў універсітэта вышаў на II месца, адстаўшы ўсяго на 30 ачкоў ад політэхнічнага інстытута. На гэтым у немалой ступені адбілася няяўка некаторых удзельнікаў, якія былі ўключаны ў зборныя каманды БДУ. Так студэнтка фізіка-матэматычнага факультэта тав. Патапенка публічна заявіла: «мне наплываць на калектыў».

27 снежня праводзіліся скачкі ўвышыню. Выдатнага поспеху дабіўся студэнт гістарычнага факультэта А. Паўлючэнка, які пераадолеў планку на вышыні 175 см. Гэты вынік з'яўляецца адным з лепшых у Беларусі не толькі ў закрытым памяшканні, але і на стадыёне.

У ходзе спаборніцтваў выявіўся рад недахопаў. Некаторыя ўдзельнікі парушаюць дысцыпліну, не з'яўляючыся на спаборніцтвы, яны яшчэ не разумеюць усёй адказнасці, якая ўскладзена на іх па абароне спартыўнай чэсці сваёй установы. Дрэнна яшчэ і тое, што секцыю наведваюць лічаныя адзінкі, нягледзячы на тое, што ва універсітэце ёсць вельмі многа студэнтаў і студэнтак, якія з поспехам могуць заняцца гэтым цікавым відам лёгкай атлетыкі. Перайшоўшы на трэці курс, дзе фізкультура з'яўляецца неабавязковай, многія студэнты кідаюць секцыі і перастаюць увогуле займацца спортам, лічачы, што гэта непатрэбная справа. З такімі памылковымі поглядамі трэба весці барацьбу.

У. АЛЕГАЎ.

Мінулае, сучаснасць і будучыня студэнтаў Ірака

Студэнцкі рух у Іраку ўзнік у выніку развіцця новых школ у хуткім часе пасля ўстанаўлення так званага рэжыму «Нацыянальнага праўлення» ў 1921 годзе. Свядомасць студэнтаў выросла ў час другой сусветнай вайны, але наша сучасная барацьба за акадэмічныя правы і свабоды пачалася толькі ў 1944 годзе, калі студэнты паспрабавалі арганізаваць Саюз студэнтаў усіх каледжаў і вышэйшых навучальных устаноў.

Дэлегацыя, якая наведала міністра адукацыі і вяла з ім перагаворы, была арыштавана, а шэсць яе членаў кінуты ў турму. Рабіліся спробы стварыць падпольную арганізацыю. Аднак месца сходу было раскрыта і большасць удзельнікаў сходу было арыштавана і адпраўлена за краты.

Узмацнеўшы і арганізаваўшыся, студэнцкі рух адыграў значную ролю ў нацыянальным паўстанні ў студзені 1948 года і быў ініцыятарам закліка да аб'яднаных дзеянняў супроць англа-іракскага дагавору Джабіра—Бевіна. Пасля анулявання дагавору Генеральны саюз студэнтаў Ірака стаў праводзіць легальную работу.

14 красавіка 1948 года быў склікан кангрэс Аль—Сэбсе («Плошчы льва»), які вызначыў мэты студэнтаў: работа, адзінства і навука. У праграме кангрэсу падкрэслівалася неабходнасць адзінства студэнтаў, незалежна ад іх нацыянальнасці, рэлігійных вераванняў, або палітычных перакананняў.

У 1950 годзе саюз зноў уйшоў у падполле. Але яго часопіс «Кефах-Эль-Талабах» працягваў выдавацца тыражом у некалькі тысяч экземпляраў. Студэнцкія арганізацыі ў розных раёнах краіны далучыліся да Генеральнага саюза студэнтаў Ірака. Саюз заваяваў значную папулярнасць і ўступіў у члены МСС. Усеагульны саюз студэнтаў-курдаў (курды складаюць прыблізна 25 працэнтаў усяго насельніцтва Ірака) быў прыняты ў члены саюза. З таго часу саюз значна пашырыў дзейнасць і вырас. У сучасны момант Генеральны саюз студэнтаў Ірака ахоплівае па меншай меры 85 працэнтаў усіх студэнтаў Ірака.

Паспяховай была дзейнасць саюза за зварот у вышэйшыя навучальныя ўстановы выключаных студэнтаў і ў арганізацыі забастовак навучаючыхся, якія выступалі з патрабаваннямі змены статутаў універсітэтаў і каледжаў. Было праведзена многа масавых і культурных мерапрыемстваў. Другімі дасягненнямі мінулага года быў пачатак выпуску студэнцкіх газет у многіх навучальных установах краіны. Шэсць студэнтаў, выключаных з ліку тых, хто атрымоўваў стыпендыі на працягванне вучобы ў Англіі, былі ўстаноўлены ў сваіх правах. Стыпендыі, адабраныя ў нашых студэнтаў у Францыі і Турцыі, былі таксама звернуты. Наша барацьба супроць абавязковага ваеннага навучання прымусіла ўрад адмяніць яго.

Наш саюз узмацніў сувязі з Міжнародным саюзам студэнтаў. Для нас гэта важна асабліва таму, што гэта дае нам магчымасць наладзіць лепшыя сувязі з іншымі краінамі, у прыватнасці, са студэнтамі Ірана, Сірыі, Паўночнай Афрыкі і Егіпта.

Мы шырока прапагандуем рашэнні III Сусветнага кангрэса студэнтаў і праграму МСС. Мы адзначалі дзень 21 лютага (Міжнародны дзень барацьбы супроць каланіялізма) і 14 красавіка (Міжнародны дзень салідарнасці з антыфашысцкай моладдзю і студэнтамі Іспаніі). Мы выдалі брашуру аб значэнні дня 14 красавіка, а таксама выпусцілі спецыяльны нумар журнала «Кефах-Эль-Талабах».

Тысячы студэнтаў адказалі на заклік саюза і прынялі ўдзел у кампаніі дапамогі ахвярам навадненння. Наш Камітэт дапамогі выпусціў дзесяткі тысяч лістовак. Нашы студэнты актыўна выступаюць у кампаніях пратэсту супроць пакістана-турэцкага пакту і прымаюць актыўны ўдзел у палітычным жыцці краіны.

У сучасны момант наш саюз падвяргаецца розным нападкам і ўціскам — на навучальныя ўстановы робяцца паліцэйскія налёты, а многія студэнты, прыгавораныя да працяглых тэрмінаў турэмнага заняволення, па сёнешні дзень знаходзяцца ў турме. Няспынна расце лік студэнтаў, зверскі закатаваных у турмах. Па нядаўна прынятаму дэкрэту члены саюза ці карыстаючыяся яго друкаванымі выданнямі прысуджваюцца да пажыццёвых катаржных работ і пазбаўлення грамадзянства.

Але мы поўны рашучасці працягваць нашу барацьбу за акадэмічныя свабоды і за ўсю праграму патрабаванняў, якая ўключае: дэмакратызацыю універсітэта, узняцце навуковага ўзроўню выкладання ў вышэйшых навучальных установах і школах, магчымасць атрымання ўсеагульнай адукацыі, паляпшэнне медыцынскага абслугоўвання студэнтаў і іх матэрыяльнага становішча, заахвочвання здатных студэнтаў у вобласці навукі, літаратуры, спорту або мастацтва, забяспечанне студэнтаў інтэрнатамі, кнігамі, бібліятэкамі і ўсім неабходным для вучобы, адмену платы за навучанне і свабодныя заняткі. Мы будзем весці барацьбу за абавязковую ўсеагульную адукацыю, за заахвочванне прафесійнага навучання, за павелічэнне ліку выкладчыкаў, за паляпшэнне ўмоў іх працы і жыцця. Другім важным бокам нашай работы з'яўляецца барацьба за павелічэнне стыпендый і прадастаўленне іх навучаючымся за мяжой, а таксама пасылка на вучобу груп студэнтаў у любую краіну, незалежна ад існуючага там рэжыму. Неадкладнай становіцца таксама барацьба супроць мілітарызацыі адукацыі, за дэмакратычныя свабоды, за павелічэнне асігнаванняў на адукацыю, за развіццё нацыянальнай культуры і мірнага будаўніцтва.

Мы будзем энергічна патрабаваць свабоды стварэння студэнцкіх саюзаў у каледжах і школах і неўмяшання ў дзейнасць студэнцкіх арганізацый, дапамогі студэнцкім арганізацыям у спартыўнай дзейнасці, арганізацыі падарожжаў, студэнцкіх лагераў і абмену дэлегацыямі са студэнтамі другіх краін.

Наша практычная дзейнасць неаддзяліма ад нашай барацьбы за нацыянальную незалежнасць, заваяванне дэмакратычных свабод і захаванне міру ва ўсім свеце.

Хаіры АБДАЛЛА.

(Часопіс «Сусветныя студэнцкія навіны»)

Рэдактар В. Л. ШАЦІЛА.

АТ 00413 **Мінск, друкарня Выдавецтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна.** Зак. 37